**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Калектарная, 10, 220004, г. Мінск
Тэл./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул. Коллекторная, 10, 220004, г. Минск
Тел./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

02.04.2009 № 06-14/д45

На № ________________

Мацкевичу С.Д. і інш.

Аб адмове ў рэгістрацыі
АКГА "Асамблея НДА"

Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь разгледжаны матэрыялы аб рэгістрацыі Асацыяцыі каардынацыі грамадскіх аб'яднанняў "Асамблея няўрадавых дэмакратычных аб'яднанняў" (далей - АКГА "Асамблея НДА").

Пры іх вывучэнні ўстаноўлены шэраг парушэнняў патрабаванняў заканадаўства, дапушчаных пры стварэнні АКГА "Асамблея НДА". Так, у адпаведнасці з арт. 48 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей – ГК РБ) устаноўчая дамова заключаецца заснавальнікамі. У якасці заснавальнікаў згодна артыкула 8 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" (далей – Закон) маюць права выступаць грамадскія аб'яднанні, якія прынялі рашэнне стварыць саюз (асацыяцыю). Аднак рашэнні большасці грамадскіх аб'яднанняў аб выступленні ў якасці заснавальнікаў АКГА "Асамблея НДА" прыняты пасля падпісання імі ўстаноўчай дамовы, чым парушаны парадак стварэння асацыяцыі.

Такім чынам, заключаная ўстаноўчая дамова супярэчыць патрабаванням заканадаўства і з'яўляецца несапраўднай (арт. 169 ГК РБ).

Не адпавядае патрабаванням заканадаўства і назва АКГА "Асамблея НДА". Яна ўтрымлівае толькі ўказанне на асноўны прадмет дзейнасці асацыяцыі і не ўтрымлівае ўказання на прадмет дзейнасці яе членаў, як таго патрабуе норма артыкула 12 Закона.

Акрамя таго, грамадскія аб'яднанні аб'ядноўваюцца ў асацыяцыі (саюзы) дзеля каардынацыі іх статутнай дзейнасці (арт. 1 Закона). Мэтавы прынцып стварэння асацыяцыі вызначае круг яе удзельнікаў. Гэтага нельга сказаць пра заснавальнікаў АКГА "Асамблея НДА". Так, мэтай і прадметам дзейнасці Грамадскага аб'яднання шматдзетных сямей Верхнядзвінскага раёна "Сем Я" з'яўляюцца работа, накіраваная на аказанне дапамогі шматдзетным сем'ям, абарона іх правоў і інтарэсаў. У мэтах дзейнасці АКГА "Асамблея НДА" вызначаецца садзейнічанне

фарміраванню ў Рэспубліцы Беларусь грамадзянскай супольнасці. Такім чынам, дзеянні вышэйназванага грамадскага аб'яднання, накіраваныя на ўдзел у стварэнні АКГА "Асамблея НДА", мэтай якой з'яўляецца іншая дзейнасць, супярэчаць статутным мэтам аб'яднання (выхад за межы яго правааздольнасці, арт. 45 ГК РБ) і з'яўляюцца неправамернымі.

На падставе выкладзенага, кіруючыся артыкулам 15 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь прынята рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі АКГА "Асамблея "НДА".

Намеснік Міністра А.А.Сіманаў

06 Паплаўская 200 61 95
02.04.2009 дак 14